■ Спорт-тайм

# Апускаемся ніжэй

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязды» расказваем пра няўдалае выступленне зборнай Беларусі на чэмпіянаце свету па хакеі, перамогу валейбольнай зборнай на турніры ва Украіне і вынікі чарговага тура чэмпіянату краіны па футболе.**

1. ***Наша нацыянальная зборная па хакеі працягвае цярпець паражэнні на чэмпіянаце свету ў Даніі.***



Перад заключным матчам хакеісты саступілі зборнай Аўстрыі 0:4 і страцілі ўсе шанцы затрымацца ў элітным дывізіёне сусветнага хакея. Перад сённяшнім матчам са славакамі беларусы займаюць восьмае месца, а значыць, у 2019 годзе згуляюць у I дывізіёне разам са Славеніяй, Казахстанам, Венгрыяй, Літвой, Рэспублікай Карэя ці Нарвегіяй.

Чэмпіянат свету ў I дывізіёне адбудзецца ў красавіку наступнага года. Месца правядзення турніру будзе вызначана пазней. Па выніках спаборніцтваў дзве найлепшыя каманды атрымаюць пуцёўку ў эліту.

Нагадаем, апошні раз у I дывізіёне беларускія хакеісты гулялі ў 2004 годзе ў Осла, дзе занялі першае месца і атрымалі правы згуляць з наймацнейшымі зборнымі свету.

2. ***Мужчынская зборная Беларусі па валейболе стала пераможцам міжнароднага турніру ва ўкраінскім Івана-Франкоўску.*** У гульні за першае месца каманда пад кіраўніцтвам трэнераў Віктара Бекшы і Дзмітрыя Ліхарада была мацнейшай за зборную Украіны 3:0. Раней нашы хлопцы абыгралі аўстрыйцаў.

Жаночая зборная Беларусі заняла другое месца на гэтых спаборніцтвах, саступіўшы на тай-брэйку ўкраінскім валейбалісткам — 2:3.

Адзначым, што абедзве беларускія валейбольныя зборныя рыхтуюцца да старту ў Еўралізе, турнір у гэтым сезоне падзелены на два дывізіёны: «залатую» і «сярэбраную» лігі. Жаночая каманда выступіць у «залатой» лізе. Першы матч падапечныя Пятра Хілько правядуць на выездзе 19 мая ў Попрадзе са Славакіяй. Мужчынская зборная стартуе ў «сярэбранай» лізе 20 мая дамашняй сустрэчай з Албаніяй.

3. ***Баскетбалісты «Цмокі-Мінск» не здолелі прабіцца ў плэй-оф Адзінай лігі ВТБ.*** У заключным матчы рэгулярнага сезона мінчане саступілі ў Санкт-Пецярбургу мясцоваму «Зеніту» з лікам 76:83. Падапечныя Аляксандра Круцікава атрымалі 8 перамог у 24 праведзеных сустрэчах і занялі 9-е месца сярод 13 удзельнікаў спаборніцтваў.

4. ***Ягор Герасімаў другі год запар стаў пераможцам турніру ва ўзбекскім Каршы з прызавым фондам 75 тысяч долараў.*** У фінальным паядынку ён абыграў яшчэ аднаго беларуса Сяргея Бетава.



Арына Сабаленка, нягледзячы на пройгрыш у другім раўндзе кваліфікацыі, усё ж выступіць у асноўнай сетцы турніру ў Рыме (прызавы фонд — 3 мільёны долараў). Беларуска, якая займае 45-е месца ў сусветным рэйтынгу, трапіла ў лік «лакі-лузераў». Першай саперніцай Арыны ў асноўным турніры стане 50-ы нумар рэйтынга WTA Се Шувэй з Кітайскага Тайбэя.

Вікторыя Азаранка (84-ы нумар сусветнага рэйтынга) у першым раўндзе ў Рыме сапернічала з японкай Наомі Асака (21).

5. ***Згуляны матчы 7-га тура чэмпіянату краіны па футболе.*** «Мінск» на сваім полі саступіў «Слуцку» — 0:2, «Смалявічы» атрымалі сваю першую перамогу ў чэмпіянаце ў матчы з «Дняпром» — 2:1, «Гомель» згуляў у нічыю з «Тарпеда-БелАЗ» — 0:0, «Дынама-Брэст» перайграла «Віцебск» — 3:1, «Шахцёр» быў мацнейшы за «Іслач» — 3:0, «Нёман» перайграў «Гарадзею» — 1:0, БАТЭ быў мацнейшы за мінскае «Тарпеда» — 2:0.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 5.07 | 21.06 | 15.59 |
| Віцебск — | 4.51 | 21.01 | 16.10 |
| Магілёў — | 4.57 | 20.56 | 15.59 |
| Гомель — | 5.01 | 20.45 | 15.44 |
| Гродна — | 5.24 | 21.20 | 15.56 |
| Брэст — | 5.31 | 21.13 | 15.42 |

### Месяц

*Маладзік у 14.48. Месяц у сузор'і Блізнят.*

### Імяніны

*Пр.* Зоі, Апанаса, Барыса, Глеба, Давыда, Рамана. *К.* Надзеі, Софʼі, Ізыдара, Яна.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**15 МАЯ**




**1845** год — нарадзіўся (вёска Свольна, цяпер у Верхнядзвінскім раёне) Іван Дзяменцьевіч Чэрскі, геолаг, географ, даследчык Сібіры. Вучыўся ў Віленскім дваранскім інстытуце. За ўдзел у паўстанні 1863—1864 гадоў пазбаўлены дваранскага звання, грамадзянскіх правоў і сасланы ў Сібір салдатам. У 1871 годзе быў запрошаны Сібірскім аддзяленнем Рускага геаграфічнага таварыства ў Іркуцк. Праводзіў геалагічныя і палеантагалагічныя даследаванні ў Саянах, Прыбайкаллі, у басейне Ангары і Ніжняй Тунгускі. Склаў першую геалагічную карту ўзбярэжжа возера Байкал. У 1885-м па запрашэнні Санкт-Пецярбургскай АН пераехаў у сталіцу. У 1891 годзе ўзначаліў экспедыцыю ў раён рэк Калыма і Індыгірка. Памёр у 1892 годзе падчас даследаванняў нізоўяў Калымы. Яго імем названы сістэма горных хрыбтоў у Паўночна-Усходняй Сібіры, хрыбет у Забайкаллі.



**1883** год — нарадзіўся (вёска Варгуцева, цяпер у Круглянскім раёне) Іосіф Іванавіч Буевіч. Рэвалюцыянер. З 1895 года — рабочы на прамысловых прадпрыемствах Пецярбурга. Удзельнік рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. У 1907-м арыштаваны, сасланы на радзіму. З 1909-га — за мяжой (Аргенціна, Францыя, ЗША), удзельнічаў у рабочым руху. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года вярнуўся на радзіму. У Оршы быў членам гарсавета, старшынёй рэўкама, камісарам працы. За агітацыю супраць Брэсцкага міра арыштаваны, але быў вызвалены падчас леваэсэраўскага бунту 6 ліпеня 1918 года. Са жніўня 1919-га на розных пасадах у Оршы і Сянне. З пачатку 1930-х гадоў у Маскве, намеснік дырэктара Музея рэвалюцыі, начальнік упраўлення Наркамата саўгасаў СССР. У 1948—1949 гадах — старшыня калгаса ў вёсцы Варгуцева. Памёр у 1964 годзе.

**1908** год — нарадзіўся Феадосій Пятровіч Кірычэнка, удзельнік баёў з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Беларусі ў час Вялікай Айчыннай вайны. Начальнік заставы ў Гродзенскім раёне старшы лейтэнант Кірычэнка ў ноч на 22 чэрвеня 1941 года адбіваў наступленне гітлераўцаў. Ужо ў 1 гадзіну 40 хвілін застава пад яго камандаваннем уступіла ў перастрэлку з варожай разведкай. У 3 гадзіны 30 хвілін мяжу пераселклі каля сотні гітлераўцаў, завязаўся няроўны бой. Кірычэнка, умела арганізаваўшы абарону, адбіў пяць варожых нападаў. Загінуў у ліку апошніх абаронцаў заставы за лафетам кулямёта ад разрыву міны. Імя Феадосія Кірычэнкі прысвоена памежнай заставе; яго імем названа вуліца ў Гродне; на месцы былой заставы ў вёсцы Доргунь Гродзенскага раёна ўстаноўлены помнік савецкім пагранічнікам.




**1848** год — нарадзіўся Віктар Міхайлавіч Васняцоў (1848—1926), рускі жывапісец. Аўтар твораў на тэмы нацыянальнай гісторыі, рускіх былін і народных казак. Аўтар карцін «Алёнушка», «Іван-царэвіч на шэрым ваўку», «Волаты», «Цар Іван Васілевіч Грозны» і іншых. У Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі знаходзяцца карціны Васняцова, сярод іх «Лес», «Узлесак» (эцюд да карціны «Алёнушка»), «Тры царэўны падземнага царства», «Партрэт сына» і іншыя. Яго імем названы вуліцы ў Брэсце, Мінску і Нясвіжы.

**1933** год — былі зацверджаны адзіныя для ўсіх рэгіёнаў краіны «Правілы руху аўтамабільнага і коннага транспарту на дарогах СССР».

**1943** год — па пастанове Прэзідыума Выканаўчага камітэта Камуністычнага інтэрнацыянала быў распушчаны Камінтэрн.

## УСМІХНЕМСЯ

Улетку кампетэнтнасць работнікаў бывае двух відаў:

1. Я не ведаю, я заўтра ў адпачынак іду.

2. Я не ведаю, я толькі з адпачынку выйшаў.

**— Чым салон прыгажосці адрозніваецца ад цырульні?**

**— Стрыгуць там прыкладна гэтак жа, але затое пасля стрыжкі кажуць: «Якая ж вы цяпер прыгожая!».**

— Любы, скажы шчыра, ты б хацеў заняцца сексам з гэтай афіцыянткай?

— Я адмаўляюся адказваць на такое пытанне, дарагая.

— А з той?

— Адмаўляюся адказваць.

— А з гэтай?

— Не.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 1847.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 14 мая 2018 года.